https://revivalbelarus.org

**Дарожная мапа рэалізацыі стратэгіі нацыянальнага адраджэння і развіцця***

***дарожная мапа з’яўляецца праграмным інструментам рэалізацыі стратэгіі і можа гнутка быць адаптаваная ў залежнасці ад кантэксту, наяўных рэсурсаў і актуальных змен прыярытэтаў*

# Першы (пераходны) этап В

## Накірункі дзейнасці па сферах дастасавання Стратэгіі

### В.І. Сфера адукацыі і навукі:

| Задачы/накірункі дзейнасці | Суб’екты | Рэсурсы | Гарызонт планавання |
|---|---|---|---|
| 1. Рэалізацыя дарожных мап на пераходны перыяд у галіне адукацыі і навукі, пачатак мерапрыемстваў па люстрацыі работнікаў сістэмы адукацыі, якія парушалі закон і прымалі прамы і непасрэдны ўдзел у рэпрэсіях і прапагандзе | Палітычны (АПКБ + ОСЦ) | фінансавы, арганізацыйны, палітычны, кадравы | да канца этапу |
| 2. Пачатак рэалізацыі рэформаў у галіне адукацыі і навукова-даследчай дзейнасці | Палітычны (АПКБ + ОСЦ+ КР), экспертная, грамадзянская супольнасць | фінансавы, арганізацыйны, палітычны | да канца этапу |
| 3. Стварэнне спецыялізаваных 2- ці 3-месячных курсаў (у залежнасці ад узроўню валодання) па вывучэнні і ўдасканаленні беларускай мовы для розных катэгорый дзяржаўных службоўцаў, выхавацеляў, настаўнікаў, выкладчыкаў, медыкаў і іншых грамадзян, якія маюць жаданне ўдасканаліць мову і падвысіць навыкі маўлення. Для дзяржслужбоўцаў, медыкаў і педагогаў курсы будуць мець абавязковы характар (з захаваннем заробку, паэтапна) | Палітычны (АПКБ + ОСЦ+ КР), профільныя навучальныя ўстановы, грамадзянскія ініцыятывы | фінансавы, арганізацыйны, палітычны, кадравы | да канца этапу |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 4. Падтрымка і прасоўванне беларусацэнтрычнай адукацыі для Беларусі і за мяжой:<br><br>а) дашкольная:<br>• далейшая падтрымка беларускамоўных установ і цэнтраў дашкольнай адукацыі для беларусаў дыяспары, перавод прыкладна паловы дзіцячых дашкольных установ у Беларусі на беларускую мову выхавання,<br>• падвышэнне заробкаў і сацыяльнага прэстыжу прафесіі выхавацеляў, а таксама 30% даплата выхавацелям, якія прайшлі курсы і/ці атэстацыю, за працу па выхаванні на беларускай мове,<br>• курсы па падвышэнні кваліфікацыі і асваенні міжнароднага досведу ў галіне дашкольнага выхавання (з захаваннем заробку, паэтапна);<br>• працяг дапамогі ў стварэнні і падтрымцы профільных анлайн-рэсурсаў | Палітычны (АПКБ + ОСЦ+ КР), грамадзянская супольнасць, бізнес-супольнасць, дыяспары | фінансавы, арганізацыйны, палітычны, метадычны, кадравы, тэхнічны | да канца этапу |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 4. Падтрымка і прасоўванне беларусацэнтрычнай адукацыі для Беларусі і за мяжой:<br><br>б) школьная:<br>• перавод прыблізна паловы ўстаноў сярэдняй адукацыі ў Беларусі на беларускую мову выкладання з паэтапнай заменай класаў з рускай мовай навучання на беларускую;<br>• падвышэнне заробкаў і сацыяльнага прэстыжу прафесіі настаўніка, а таксама 30% даплата настаўнікам, якія прайшлі курсы і /ці пераатэстацыю, за выкладанне прадметаў на беларускай мове;<br>• далейшая праца па падрыхтоўцы падручнікаў і метадычнага забеспячэння, стварэнне аўтарскіх калектываў і рэвізія наяўнага фонду вучэбна-метадычнага забеспячэння навучальнага працэсу;<br>• далейшая падтрымка дзейнасці сеткі беларускіх школ выходнага дня ў краінах з беларускай дыяспарай, пачатак іх гарманізацыі з нацыянальнай адукацыйнай сістэмай у краіне;<br>• спрыянне школам для беларускай меншасці ў краінах-суседзях, аднаўленне працы школ з атрыманнем адукацыі на роднай мове для нацыянальных меншасцяў у Беларусі | Палітычны (АПКБ + ОСЦ + КР), грамадзянская супольнасць, бізнес-супольнасць, дыяспары (праграма «Васьміног») | фінансавы, арганізацыйны, метадычны, кадравы, тэхнічны | да канца этапу |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 4. Падтрымка і прасоўванне беларусацэнтрычнай адукацыі для Беларусі і за мяжой:<br><br>в) вышэйшая:<br>• пачатак рэлакацыі беларускага навукова-даследчага ўніверсітэта ў эміграцыі ў Беларусь, магчымае пакіданне філіяла за мяжой;<br>• захады па паступовым пераводзе навучальнага працэсу ў беларускіх ВНУ на беларускую мову выкладання для большай часткі гуманітарных, тэхнічных і прыродазнаўчых спецыяльнасцяў;<br>• падвышэнне заробкаў і сацыяльнага прэстыжу прафесіі выкладчыка ВНУ, а таксама работнікаў акадэмічных і навуковых установаў і інстытутаў, 30% даплата выкладчыкам, якія прайшлі курсы і/ці атэстацыю, за выкладанне курсаў на беларускай мове;<br>• адкрыццё новых беларускіх праграм, цэнтраў і курсаў ва ўніверсітэтах краін свету;<br>• узмацненне і падтрымка наяўных адукацыйных ініцыятыў і інстытуцый у галіне вышэйшай адукацыі для беларусаў;<br>• стварэнне і падтрымка новых праграм акадэмічнай мабільнасці для студэнтаў і навукоўцаў;<br>• праграмы стажыровак для бакалаўраў, магістраў, выкладчыкаў і навукоўцаў;<br>• пачатак мерапрыемстваў па вяртанні Беларусі ў Балонскі працэс | Палітычны (АПКБ + ОСЦ + КР, і інш.), акадэмічная супольнасць (ЕГУ, БААН, і інш.), грамадзянская супольнасць, бізнес-супольнасць, дыяспары, экспертная і прафесійная супольнасць (праграмы EU4Belarus – SALT-1,2, Каліноўскага і інш.) | фінансавы, арганізацыйны, метадычны, кадравы, тэхнічны | да канца этапу |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 4. Падтрымка і прасоўванне беларусацэнтрычнай адукацыі для Беларусі і за мяжой:<br><br>г) прафесійная (бізнес, IT і г.д.):<br>• працяг падтрымкі праграм і цэнтраў прафесійнай адукацыі і падрыхтоўкі для беларускіх навучэнцаў за межамі Беларусі, іх (частковая) рэлакацыя ў Беларусь, адкрыццё новых праграм і цэнтраў;<br>• падтрымка анлайн-рэсурсаў для суправаджэння праграм прафесійнай адукацыі | Палітычны (АПКБ + ОСЦ + КР, і інш.), акадэмічная супольнасць (ЕГУ, БААН і інш.), грамадзянская супольнасць, бізнес-супольнасць (Imaguru + ABBA, инш.), дыяспары | фінансавы, арганізацыйны, кадравы, метадычны, тэхнічны | да канца этапу |
| 4. Падтрымка і прасоўванне беларусацэнтрычнай адукацыі для Беларусі і за мяжой:<br><br>д) нефармальная:<br>• падтрымка і ўзмацненне існых і фасілітацыя ўзнікнення новых праграм і курсаў па нефармальнай адукацыі;<br>• падтрымка комплекснай абалонкі для анлайн-курсаў нефармальнай адукацыі (беларускай Cursera);<br>• падтрымка асацыяцыі арганізацый нефармальнай адукацыі і крос-платформ для супрацоўніцтва і абмену вопытам і інфармацыяй | Палітычны (АПКБ + ОСЦ + КР, і інш.), акадэмічная супольнасць (ЕГУ, БААН, ЛУ, БК і інш.), грамадзянская супольнасць, бізнес-супольнасць, дыяспары | фінансавы, арганізацыйны, кадравы, метадычны, тэхнічны | да канца этапу |
| 5. Працяг курсаў па сістэматычнай падрыхтоўцы кадраў (настаўнікі, выкладчыкі і менеджары адукацыі для Новай Беларусі) «Новыя адукатары», частковая рэлакацыя праграм у Беларусь | Палітычны (АПКБ + ОСЦ + КР, і інш.), акадэмічная супольнасць (ВБУ, ЕГУ, Акадэмія, БААН, і інш.), грамадзянская супольнасць, бізнес-супольнасць, экспертная і прафесійная супольнасць, беларускія і замежныя навучальныя ўстановы | фінансавы, арганізацыйны, кадравы, метадычны, тэхнічны | да канца этапу |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 6. Далейшая інтэграцыя ў адукацыйныя праграмы і сістэмы элементаў беларускага нацыянальнага мэйнстрыму (веданне пантэона нацыянальных герояў, традыцый і пазітыўных міфаў, нацыянальна-арыентаваная і дэкаланіяльная візія гісторыі краіны і рэгіёна) і грамадзянска-прававой адукацыі і функцыянальнай пісьменнасці (прававая, грамадзянская, палітычная, фінансавая і медыяпісьменнасць) на нацыянальным узроўні | Палітычны (АПКБ + ОСЦ + КР, і інш.), акадэмічная супольнасць (ВБУ, ЕГУ, Акадэмія, БААН, і інш.), грамадзянская супольнасць, бізнес-супольнасць, экспертная і прафесійная супольнасць | фінансавы, арганізацыйны, кадравы, метадычны, тэхнічны | да канца этапу |

**B.II. Сфера культуры, крэатыўнай індустрыі і медыя**

| Задачы/накірункі дзейнасці | Суб'екты | Рэсурсы | Гарызонт планавання |
|---|---|---|---|
| 1. Захаванне і развіццё экасістэмы нацыянальнай культуры:<br>а) экстранная падтрымка культуры ў Беларусі і па-за межамі:<br>• перагляд спіса экстрэмісцкіх матэрыялаў, зняцце забароны і штучных абмежаванняў (ліцэнзіі, гастрольныя пасведчанні, атэстацыі экскурсаводаў і т.п.) на выдавецкую, даследчыцкую, кінематаграфічную, музычную, культурніцкую дзейнасць;<br>• рэабілітацыя актывістаў і арганізацый, пацярпелых за сваю грамадска-палітычную і нацыянальна-культурніцкую працу (скласці спісы), і аказанне падтрымкі ў аднаўленні дзейнасці тых праектаў, што не страцілі актуальнасць і каманду;<br>• працяг праграмы арт-рэзідэнцый для творцаў;<br>• стыпендыі і зваротная рэлакацыя для змушаных мігрантаў-творцаў;<br>• стварэнне і перапрафіляванне пляцовак і арт-прастор для дзейнасці ў краіне і за мяжой (галерэі, дамы культуры, сцэны, канцэртныя залі); | Палітычны (АПКБ + ОСЦ + КР, і інш.), кааліцыя арганізацый культуры, грамадзянская супольнасць, бізнес-супольнасць, дыяспары, замежныя партнёры | фінансавы, арганізацыйны, кадравы, тэхнічны, палітычны | да канца этапу |

| | | | |
|---|---|---|---|
| • фасілітацыя разавых культурных івэнтаў і тэматычных падзей (тыдзень беларускай культуры, «Ноч расстраляных паэтаў» і т.п.) | | | |
| 1. Захаванне і развіццё экасістэмы нацыянальнай культуры:<br>б) доўгатэрміновыя праекты падтрымкі і развіцця культуры і крэатыўнай індустрыі:<br><br>• захады па павелічэнні долі выдаткаў на культуру ў агульнадзяржаўным бюджэце: з менш чым 1% да 2,5% ад аб’ёму гадавога бюджэту. Гэта дасць магчымасць шырока падтрымліваць культурніцкія ініцыятывы, музейную справу, аднаўленне гісторыка-культурнай спадчыны (палацаў, замкаў, сядзіб, ратуш, цэркваў і паркаў);<br>• працяг праграмы падрыхтоўкі менеджараў культуры;<br>• падтрымка дзейнасці рэсурсных цэнтраў;<br>• падтрымка і рэлакацыя інстытуцый, якія займаюцца стратэгічным планаваннем у галіне, захоўваюць фонды і акумулююць рэсурс для падтрымкі арганізацый і творцаў (Інстытуты кнігі, тэатра, кіно, публічнай гісторыі, і г.д., музеі і архівы);<br>• падтрымка масавых і цыклічных актыўнасцяў (фестывалі, кангрэсы, чытанні, спартыўныя мерапрыемствы і г.д.), якія дэманструюць найлепшыя наробкі сучаснай беларускай культуры і ўводзяць іх у міжнародны кантэкст;<br>• пошук стратэгічных грантавых праграм для падтрымкі беларускай культуры, стратэгічнае партнёрства;<br>• распрацоўка заканадаўчай базы і прэферэнцый для развіцця мецэнацтва і залучэння нацыянальна арыентаванага бізнесу і грамадзянскай супольнасці ў справу ахвяравання і спансавання беларускай культуры на лакальным і глабальным узроўнях | Палітычны (АПКБ + ОСЦ + КР, і інш.), БРК, кааліцыя арганізацый культуры, грамадзянская супольнасць, бізнес-супольнасць, дыяспары, замежныя партнёры | фінансавы, арганізацыйны, кадравы, тэхнічны | да канца этапу |
| 2. Прамоцыя Беларусі і стварэнне пазітыўнага і пазнавальнага брэнда беларускай культуры за мяжой і ўнутры краіны:<br>• дзяржаўная падтрымка і рэлакацыя арганізацыі для комплекснай прамоцыі беларускай культуры, накшталт | Палітычны (АПКБ + ОСЦ + КР, і інш.), БРК, кааліцыя арганізацый культуры, грамадзянская супольнасць, бізнес- | фінансавы, арганізацыйны, тэхнічны, палітычны | да канца этапу |

| | | | |
|---|---|---|---|
| нямецкага Інстытута Гётэ: праца на нацыянальным і міжнародным узроўні;<br>• лабіраванне беларускіх культурных івэнтаў і сумесных праектаў у краінах свету, фасілітацыя шырокага культурнага абмену і залучэння беларускай культуры ў сусветную павестку;<br>• прасоўванне беларускіх культурных, навуковых і адукацыйных прадуктаў і брэндаў на сусветна вядомых пляцоўках;<br>• прапаганда творчасці беларускіх аўтараў у свеце (пераклады, сумесныя пастаноўкі, выставы, музычныя прэм’еры і т.п.);<br>• прасоўванне і папулярызацыя пантэона герояў, міфаў, легендаў і сімвалаў нацыянальнай культуры, прывабных для выкарыстання як самой беларускай супольнасцю, так і пазнавальных і вядомых для замежнай аўдыторыі;<br>• рэалізацыя адпаведнай палітыкі памяці і інструментаў публічнай гісторыі з вяртаннем у шырокі распаўсюд нацыянальнай сімволікі, неідэалагізаванай версіі гісторыі і гісторыі беларускай дзяржаўнасці, гісторыка-культурная дыпламатыя;<br>• праца па рэвізіі і развіцці нацыянальнай традыцыі і культуры, фасілітацыя стварэння сучаснай і канкурэнтнай версіі беларускай культуры і крэатыўнай індустрыі праз розныя інструменты;<br>• падтрымка культурных прадуктаў на мовах нацыянальных меншасцяў, а таксама залучэнне этнакультурнай спадчыны народаў, што стваралі ў Беларусі, у агульную нацыянальную рамку (пераклады, вывучэнне, рэактуалізацыя, напрыклад, яўрэйскай гарадской культуры 18-20 ст.);<br>• прасоўванне на міжнародным узроўні новага іміджу Беларусі як сучаснай і паспяховай краіны магчымасцяў, раскрыццё турыстычнага патэнцыялу Беларусі | супольнасць, дыяспары, экспертная і прафесійная супольнасць, замежныя партнёры | | |
| 3. Папулярызацыя беларускай мовы і прадуктаў на яе аснове:<br>• ініцыяванне шэрага публічных дыскусій і абмеркаванняў дзеля выпрацоўкі рашэння на агульнадзяржаўным узроўні | Палітычны (АПКБ + ОСЦ + КР, і інш.), БРК, кааліцыя арганізацый | фінансавы, арганізацыйны, | да канца этапу |

| | | | |
|---|---|---|---|
| аб статусе беларускай мовы як адзінай дзяржаўнай, пры адначасовым замацаванні ў Канстытуцыі права нацыянальным меншасцям, якія здаўна пражываюць на тэрыторыі Беларусі, карыстацца сваімі мовамі і атрымліваць на іх адукацыю;<br>• прасоўванне і замацаванне спецыяльнай лексікі навук, прафесій і сфер у адукацыйным, культурным і медыяполі;<br>• фасілітацыя адмысловых курсаў і праграм па вывучэнні беларускай мовы і ўдасканаленні жывой практыкі яе выкарыстання на агульнадзяржаўным узроўні;<br>• працяг падтрымкі міжнародных сертыфікатаў для вывучэння беларускай мовы як замежнай, падрыхтоўка падручнікаў і дапаможных матэрыялаў, распрацоўка адпаведных курсаў для замежнікаў ва ўстановах адукацыі;<br>• захады па павелічэнні якаснага беларускамоўнага кантэнту забаўляльных і пазнавальных перадач, матэрыялаў СМІ, папулярных блогаў і г.д.;<br>• захады па папулярызацыі шырокага ўжывання беларускай мовы ў паўсядзённай камунікацыі, побытавай і публічнай праз інстытут беларускамоўных «зорак», фестывалі і імпрэзы;<br>• падтрымка выдання кніг і выдавецкай дзейнасці на беларускай мове, роўныя ўмовы дзейнасці для прыватных і дзяржаўных выдавецтваў і падатковыя зніжкі, падтрымка стварэння іншага крэатыўнага кантэнту па-беларуску | культуры, грамадзянская супольнасць, бізнес-супольнасць, дыяспары, экспертная і прафесійная супольнасць, замежныя партнёры | тэхнічны, палітычны | |
| 4. «Беларусізацыя лічбавых рэсурсаў і дыгіталізацыя беларушчыны»:<br>• працяг працы па фасілітацыі з'яўлення беларускамоўных версій папулярных інтэрнэт-сэрвісаў, прыкладанняў (YouTube, Spotify і г.д.), прасоўванне беларускай мовы для манетызацыі сэрвісаў;<br>• захады па папулярызацыі працы над стварэннем беларускамоўнай Уікіпедыі, яе выкарыстання ў асяроддзі саміх беларусаў;<br>• падтрымка перакладаў на беларускую мову замежных фільмаў, серыялаў, кніг і т.п. і размяшчэнне на лічбавых платформах; | Палітычны (АПКБ + ОСЦ + КР, і інш.), БРК, кааліцыя арганізацый культуры, грамадзянская супольнасць, бізнес-супольнасць, дыяспары, экспертная і прафесійная супольнасць, прагрэмісты | фінансавы, арганізацыйны, тэхнічны, палітычны | да канца этапу |

| | | | |
|---|---|---|---|
| • аблічбоўка архіваў матэрыяльнай культуры, захаванне і каталагізацыя культурнай спадчыны;<br>• стварэнне новых арыгінальных і аўтэнтычных лічбавых прадуктаў | | | |
| 5. Узмацненне нацыянальнай медыясферы (сеткі стваральнікаў медыякантэнту і распаўсюду матэрыялаў для беларускай аўдыторыі як нацыянальнай медыяплатформы):<br>• рэалізацыя дарожнай мапы па рэарганізацыі дзяржаўных СМІ і дэідэалагізацыі сферы;<br>• падтрымка нацыянальных медыя на некалькіх мовах (беларуская, англійская, нямецкая і т.п.);<br>• падтрымка інстытута публічнай экспертызы і крытыкі, прафесійных журы;<br>• дэкаланізацыя нацыянальнага наратыву (мерапрыемствы, матэрыялы і т.п.) і спрыянне паўставанню арыгінальных і якасных медыяпрадуктаў сусветнага ўзроўню;<br>• стварэнне «гісторый поспеху» звычайных і выбітных беларусаў, іх медыйнае прасоўванне як візуалізацыя «нацыянальнай мары» і выбудова пазітыўнага іміджу краіны і беларусаў у медыяполі | Палітычны (АПКБ + ОСЦ + КР, і інш.), журналісцкая супольнасць (БАЖ + Прэс-клуб + рэдакцыі СМІ + блогеры, інш.), грамадзянская супольнасць, лічбавыя праекты, дыяспары | фінансавы, арганізацыйны, тэхнічны, палітычны | да канца этапу |

**В.III. Сфера палітыкі (унутранай і міжнароднай), права і абароны**

| Задачы/накірункі дзейнасці | Суб’екты | Рэсурсы | Гарызонт планавання |
|---|---|---|---|
| 1. Пачатак рэалізацыі праграмы па стварэнні ўстойлівай нацыянальнай унутрыпалітычнай сістэмы:<br>• стварэнне камісій па рэабілітацыі ахвяр палітычных рэпрэсій часоў таталітарызму і аўтарытарызму на тэрыторыі Беларусі, адкрыццё архіваў КДБ;<br>• пачатак грамадскіх і судовых працэсаў па люстрацыі былых ідэалагічных работнікаў, кіраўніцтва выбарчых камісій, медыяпрапагандыстаў і чыноўнікаў, | Палітычны (АПКБ + ОСЦ + КР+НАУ, партыі і інш.), грамадзянская супольнасць, бізнес-супольнасць, дыяспары, замежныя партнёры | фінансавы, арганізацыйны, кадравы, тэхнічны | да канца этапу |

| | | | |
|---|---|---|---|
| праваахоўнікаў, вінаватых у парушэнні закона, а таксама іншых катэгорый грамадзян у адпаведнасці з распрацаванай канцэпцыяй і дарожнай мапай па люстрацыі;<br>• пачатак рэарганізацыі органаў дзяржаўнага кіравання і выкарыстанне інструментаў кадравага рэзерву і іншых механізмаў абнаўлення адміністрацыі на рэгіянальным і агульным узроўні;<br>• пачатак рэалізацыі рэформы партыйнай сістэмы і падвышэння ролі партый і грамадскіх арганізацый і рухаў у дзяржаве;<br>• пачатак рэарганізацыі сістэмы рэальнага прадстаўніцтва розных груп насельніцтва на ўсіх узроўнях дзяржаўнага кіравання, распрацоўка механізмаў;<br>• пачатак рэалізацыі механізмаў рэальнага ўплыву грамадзян на палітычнае жыццё краіны праз інструменты прамой дэмакратыі, звароты і петыцыі, а таксама працэдуры адклікання палітычных прадстаўнікоў;<br>• пачатак рэалізацыі сістэмы мер па пашырэнні палітычнай і прававой пісьменнасці, грамадзянскай адукацыі праз адукацыйныя і медыйныя інструменты;<br>• пачатак пераразмеркавання ролі і функцый дзяржавы і дзяржаўнага кіравання ў рэгуляванні жыцця грамадства і яго інстытутаў, «раздзяржаўліванне» грамадска-палітычнай сферы і больш шырокае выкарыстанне электроннага ўрада і іншых механізмаў грамадскага кіравання грамадска-палітычнымі працэсамі;<br>• паступовае правядзенне паслядоўнай і сістэмнай палітыкі 4Д (дэімперыялізацыі, дэкамунізацыі, дэідэалагізацыі і дэкаланізацыі) у адукацыі, культуры, СМІ, палітычнай і сацыяльных сферах;<br>• стварэнне нацыянальнага і мясцовых грамадскіх камітэтаў па вяртанні населеным пунктам, вуліцам і г.д. гістарычных назваў, а таксама замены назваў, якія з'яўляюцца каланіяльнымі, таталітарнымі і імперскімі | | | |
| 2. Падрыхтоўка да змен асноўных прыярытэтаў і інструментаў нацыянальнай міжнароднай палітыкі: | Палітычны (АПКБ + ОСЦ + КР+НАУ, і інш.), | фінансавы, арганізацыйны, кадравы, | да канца этапу |

| | | | |
|---|---|---|---|
| • пачатак рэалізацыі новага знешнепалітычнага курсу, перагляд удзелу Беларусі ў міждзяржаўных і міжнародных саюзах і пагадненнях, падпісанне дакументаў аб намерах уступлення ў стратэгічныя міжнародныя арганізацыі і аб’яднанні з улікам нацыянальных інтарэсаў;<br>• працяг рэалізацыі еўрапейскага вектара развіцця Беларусі, пашырэнне праграмы Усходняга партнёрства, інтэнсіфікацыя высілкаў па здабыцці статусу краіны-сябра ЕС, пачатак рэалізацыі стратэгічных мэт і задач рэгіянальнага развіцця;<br>• дэнансацыя дамоў і выхад з палітычных саюзаў і аб’яднанняў, заключаных нелегітымнымі ўладамі насуперак нацыянальным інтарэсам Беларусі і народа;<br>• расследаванне злачынстваў (ваенных, супраць грамадства і асобных груп насельніцтва) рэжыму Лукашэнкі і стварэнне адмысловых камісій і следчых груп па выяўленні асноўных фактаў і падачы дакументаў у міжнародныя і нацыянальныя судовыя органы;<br>• захады па прасоўванні пазітыўнага вобраза дэмакратычнай Беларусі і яе народа праз палітычныя, медыйныя, культурныя і адукацыйныя інструменты, культурная дыпламатыя | народныя амбасады, грамадзянская супольнасць, бізнес-супольнасць, дыяспары, замежныя партнёры | тэхнічны, палітычны | |
| 3. Пачатак рэалізацыі праграмы пабудовы ўстойлівай нацыянальнай канстытуцыйна-прававой сістэмы:<br>• рэактуалізацыя і перагляд наяўнай юрыдычна-прававой базы кодэксаў, законаў і падзаконных актаў, пошук супярэчнасцяў і парушэнняў нормаў Канстытуцыі і правоў чалавека, скасаванне ўсіх законных і падзаконных актаў, якія парушаюць Канстытуцыю і асноўныя правы чалавека і грамадзяніна;<br>• пачатак рэформы службаў аховы правапарадку, судовай сістэмы (кваліфікацыйныя камісіі), следчых органаў і пракуратуры, сістэмы органаў нацыянальнай бяспекі і т.п.;<br>• рэалізацыя дарожнай мапы на транзітны перыяд у галіне сістэмы права, судовай сістэмы, пракуратуры і органаў нацыянальнай бяспекі; | Палітычны (АПКБ + ОСЦ + КР+НАУ, і інш.), новыя праваахоўныя органы (BYPOL/BELPOL), грамадзянская супольнасць, праваабарончыя арганізацыі, незалежныя прафсаюзы, бізнес-супольнасць, народныя амбасады дыяспары, экспертная і прафесійная | фінансавы, арганізацыйны, кадравы, тэхнічны, палітычны | да канца этапу |

| | | | |
|---|---|---|---|
| • захады па дэкамунізацыі і гуманізацыі заканадаўства, скасаванні рэпрэсіўных нормаў на карысць больш «мяккай» і чалавечнай сістэмы рэгулявання прававых стасункаў у дзяржаве, праект;<br>• працяг падтрымкі і развіццё грамадскіх структур дасудовай юрыдычнай медыяцыі для арганізацый і фізічных асоб;<br>• інтэграцыя альтэрнатыўнай юрыдычна-прававой сістэмы дачыненняў грамадства і дзяржавы (пашпарт Новай Беларусі, электронны ўрад і т.п.) у дзяржаўную сістэму Беларусі, выпрацоўка агульнага падыходу;<br>• пачатак рэарганізацыі і рэформы прафсаюзных арганізацый, павелічэнне іх уплыву на грамадскія і гаспадарчыя працэсы ў дзяржаве | супольнасць, замежныя партнёры | | |
| 4. Захады па ажыццяўленні вайсковай рэформы і стварэнні нацыянальнага войска:<br>• рэалізацыя праекта па дэкамунізацыі беларускага войска (вяртання да абгрунтаваных нацыянальнай гісторыяй сістэм званняў і ўзнагарод, перагляд пад патрэбы сучаснай вайсковай навукі і практыкі сістэмы вайсковых злучэнняў і груп, адмовы ад практык знявагі асабістага гонару і годнасці вайскоўцаў падчас праходжання вайсковай службы);<br>• пачатак рэалізацыі праекта пераходу да прафесійнай (кантрактнай) арміі і сістэмы кароткатэрміновых курсаў эфектыўнай вайсковай падрыхтоўкі для грамадзян;<br>• увядзенне ў дзеянне новага вайсковага статута, а таксама выкарыстанне беларускай вайсковай тэрміналогіі, перавод на беларускую мову справаводства і камунікацыі ў арміі;<br>• пачатак рэалізацыі канцэпцыі нацыянальнага выхавання вайскоўцаў праз інструменты нацыянальнага пантэона герояў, памятных дат, вайсковай гісторыі і традыцый, безумоўнага апірышча на нацыянальныя інтарэсы | Палітычны (АПКБ + ОСЦ + КР+НАУ, і інш.), новыя мілітарныя арганізацыі (ПКК, Паспалітае рушэнне, інш.), грамадзянская супольнасць, дыяспары, экспертная і прафесійная супольнасць, замежныя партнёры | фінансавы, арганізацыйны, кадравы, тэхнічны, палітычны | да канца этапу |

**B.IV. Сфера эканомікі, мясцовага самакіравання, сацыяльнага забеспячэння і аховы здароўя**

| Задачы/накірункі дзейнасці | Суб'екты | Рэсурсы | Гарызонт планавання |
|---|---|---|---|
| 1. Пачатак рэалізацыі нацыянальнай праграмы ўстойлівага развіцця эканомікі, бізнесу і інвестыцый:<br>• пачатак рэарганізацыі асноўных накірункаў развіцця нацыянальнай гаспадаркі з пункту гледжання эфектыўнасці і перспектыўнасці ў рэгіянальным і глабальным кантэкстах;<br>• пачатак рэалізацыі канцэпцыі эканамічнага і тэхналагічнага рыўка для Новай Беларусі (праграма «з трэцяга свету ў першы») як грамадска-палітычнага ідэалу;<br>• пачатак рэалізацыі канцэпцыі развіцця і плана рэфармавання беларускай эканомікі і інвестыцыйнай дзейнасці;<br>• рэалізацыя дарожнай мапы па кіраванні сферай прамысловасці, сельскай гаспадаркай і інвестыцыйнай дзейнасцю на пераходны перыяд;<br>• інтэграцыя альтэрнатыўнай фінансавай сістэмы на базе беларускага бізнесу за мяжой (беларускіх банкаў, інвестыцыйных фондаў, протападатковай сістэмы і т.п.) у дзяржаўную сістэму Беларусі;<br>• захады па спрыянні фінансавай пісьменнасці і бізнес-адукацыі для беларусаў | Палітычны (АПКБ + ОСЦ + КР, і інш.), грамадзянская супольнасць, бізнес-супольнасць (ABBA, Imaguru, інш.), дыяспары, экспертная і прафесійная супольнасць, замежныя партнёры | фінансавы, арганізацыйны, кадравы, тэхнічны, палітычны | да канца этапу |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 2. Рэалізацыя дзейснай сістэмы мясцовага самакіравання і самафінансавання грамадскіх праектаў:<br>• пачатак рэалізацыі праекта рэформы органаў мясцовага самакіравання, змены іх ролі і функцый у дзяржаве;<br>• працяг і падтрымка традыцыі гарадскіх магістратаў як аднаўлення на новым этапе традыцыі мясцовага кіравання і самафінансавання на прыкладзе супольнасцяў беларускай дыяспары і перанос у Беларусь;<br>• павелічэнне ролі і магчымасцяў мясцовага самакіравання праз інструменты электроннага ўрада, лічбавай дзяржавы на базе прыкладання «Новая Беларусь», інтэграцыя ў агульную сістэму дзяржаўнага кіравання;<br>• далейшае ажыццяўленне падтрымкі лакальных супольнасцяў і развіцця КОТэГСаў у Беларусі | Палітычны (АПКБ + ОСЦ + КР, і інш.), грамадзянская супольнасць, бізнес-супольнасць (ABBA, Imaguru, інш.), дыяспары, экспертная і прафесійная супольнасць | фінансавы, арганізацыйны, кадравы, тэхнічны | да канца этапу |
| 3. Пачатак рэструктурызацыі і рэформы ў сферы сацыяльнай палітыкі і аховы здароўя для ўстойлівага развіцця грамадства:<br>• рэалізацыя праекта па зменах прынцыпаў і падыходаў па гарантыях сацыяльнага забеспячэння для ўразлівых груп насельніцтва, людзей з абмежаванымі магчымасцямі, беспрацоўных, шматдзетных сем’яў і т.п.;<br>• пачатак рэалізацыі канцэпцыі і праекта рэфармавання сістэмы сацыяльнага страхавання і абароны, пераход да комплекснай стратэгіі сацыяльнага забеспячэння;<br>• пачатак рэалізацыі канцэпцыі і праекта рэформ у галіне аховы здароўя, пераходу да страхавой медыцыны і сістэмы сацыяльных гарантый для ўразлівых груп;<br>• імплементацыя дарожных мап на пераходны ерыяд у галіне сацзабеспячэння і аховы здароўя | Палітычны (АПКБ + ОСЦ + КР, і інш.), грамадзянская супольнасць, бізнес-супольнасць (ABBA, Imaguru, інш.), дыяспары, экспертная і прафесійная супольнасць | фінансавы, арганізацыйны, кадравы, тэхнічны, палітычны | да канца этапу |